# Месца для душы

**У кожнай установе адукацыі ёсць кабінет педагога-псіхолага. Няхай ён будзе невялікім і ўтульным, прасторным і светлым, маленькім і цёплым, у ім заўсёды адчынены дзверы для тых, хто жадае пагаварыць пра надзённае.**

На маю думку, кабінет педагога-псіхолага — гэта месца, якое дазваляе пазбавіцца негатыўных думак, перажыванняў. Але, акрамя гэтага, ён выконвае асаблівую ролю: з'яўляецца сховішчам таямніц і сакрэтаў. Удзельнікі адукацыйнага працэсу прыходзяць да мяне з рознымі сітуацыямі: няўпэўненасцю падлетка пры зносінах з раўеснікамі, неразуменнем паміж маці і дачкой, упадкам прафесійных і творчых сіл у педагога. Звяртаюцца таму, што я не адмаўляюся выслухаць. А так важна быць пачутым. На мой погляд, гэта з'яўляецца адной з галоўных якасцей у рабоце педагога-псіхолага.

Мой кабінет функцыянуе ўжо другі год. За гэты час ён паспеў зарэкамендаваць сябе з добрага боку і шмат у чым мне дапамог: магчымасць правядзення трэнінгаў і індывідуальнай работы, з'яўленне зоны рэлаксацыі, асобная шафа для захавання дакументацыі. Як жа добра, калі ёсць свой асабісты кабінет, і гэта нягледзячы на тое, што я працую ў сельскай школе (многія педагогі-псіхолагі гарадскіх і сельскіх школ дзеляць свой кабінет з сацыяльным педагогам і пазбаўлены магчымасці праводзіць індывідуальную работу).

Кабінет у мяне невялікі, але ўтульны. Я задумала зрабіць яго прыемным і не падобным на іншыя кабінеты педагогаў-псіхолагаў, і мне, здаецца, гэта ўдалося. Асаблівасць яго ў двух элементах: матыльках-рэлаксатарах і лялечным тэатры. Раскажу па парадку.

Матылькі і кветкі — як добрае надвор'е, без якіх і дзень не дзень. Таму на сцяне ў кабінеце вісяць карціны з выявамі кветак, а перад імі размясцілася дарожка рознакаляровых матылькоў. Лёгкі павеў ветрыку — і яны ўжо кружацца. Варта прысесці на канапу і паглядзець на махаонаў, як увесь негатыўны настрой развейваецца (асабліва добра працуе з педагогамі, падлеткамі). Навучэнцы выкарыстоўваюць хвіліны перапынкаў, каб палюбавацца маім кабінетам. Педагогі атрымліваюць асалоду ад стварэнняў, якія пырхаюць, і часам гавораць такія словы: "можна я проста пасяджу і пагляджу на матылькоў", "становіцца радасней, калі я гляджу на матылькоў, якія мільгаюць". Мне такое прыемна чуць, бо гэтыя словы пацвярджаюць, што атмасфера кабінета дапамагае, а значыць, мая праца не дарэмная.

Словы, што ўвесь свет тэатр, а людзі ў ім акцёры, навялі мяне на стварэнне ўласнага лялечнага тэатра. Збудаванне ўяўляе сабой сапраўдны лялечны дом. Залацістыя шторы, блакітны дах і сцены, утульная сцэна, неабходная мэбля для герояў — усё гэта не пакідае абыякавым гледача. З дапамогай лялек навучэнцы імітуюць розныя сітуацыі: узаемаадносіны ў класным калектыве, адлюстраванне свайго "Я", атмасферы ў сям'і. Лялечны тэатр найбольш цікавы для навучэнцаў 2—5-х класаў. Праз прызму гульні дзеці паказваюць хвалюючыя моманты як у школе, так



і ў жыцці. Часам у тэатралізаванай гульні дакладна паказана сітуацыя, з якой дзіця не ведае, яе справіцца (добра прымяняць ролевыя гульні з навучэнцамі 5 класа ў перыяд адаптацыі, чым знімаецца хваляванне і павышаецца пазітыўны настрой). Мая задача заключаецца ў тым, каб дапамагчы знайсці станоўчы выхад з сітуацыі.

У кабінет педагога-псіхолага людзі прыходзяць радзей, чым, скажам, у магазін. Аднак эмацыянальна "галодны" чалавек будзе шукаць дапамогі ў вырашэнні асабістых пытанняў у кампаніі псіхолага. А месца, у якім наведвальнік будзе знаходзіцца, кабінет, з'яўляецца прыстанкам добрага настрою і месцам для душы.

**Гражына ЛЯНЦЭВІЧ,**
**педагог-псіхолаг Лялюкінскага дзіцячага сада — сярэдняй школы Іўеўскага раёна.**